Інструмент, які варта асвойваць

Аўтар: Кацярына Паўлоўская
20.02.2022 00:00



Перад споведдзю мы часта адчуваем страх. Што ўжо казаць пра генеральную споведзь. Але ў страху толькі вочы вялікія, а генеральная споведзь з’яўляецца карысным інструментам духоўнага жыцця. Пра тое, чым генеральная споведзь адрозніваецца ад традыцыйнай, калі яна патрэбна і як да яе рыхтавацца мы пагаварылі з бр. Сяргеем Мацюшонкам з Ордэна Меншых Братоў Капуцынаў, якія “спецыялізуюцца” ў спавяданні і духоўным кіраўніцтве.

– Брат Сяргей, чым адрозніваецца генеральная споведзь ад традыцыйнай?

– Генеральная споведзь – гэта тая самая споведзь, толькі з іншага перыяду жыцця. Звычайна спавядаемся з прамежку часу ад апошняй споведзі да сённяшняга дня. Генеральная ж споведзь ахоплівае альбо ўвесь перыяд жыцця да моманту першай генеральнай споведзі, альбо ад апошняй генеральнай споведзі да актуальнай. Адзінае, калі дарослы чалавек першы раз ідзе да споведзі, то ў яго першая споведзь атрымліваецца як генеральная.

Інструмент, які варта асвойваць

Аўтар: Кацярына Паўлоўская
20.02.2022 00:00

